THE NOBEL PEACE PRIZE

# НОБЕЛЕЎСКАЯ ПРЭМІЯ МІРУ 2022

Нарвежскі Нобелеўскі камітэт пастанавіў прысудзіць Нобелеўскую прэмію міру за 2022 год адной прыватнай асобе і дзвюм арганізацыям.

Лаўрэаты прэміі прадстаўляюць грамадзянскую супольнасць сваіх краінаў. На працягу многіх гадоў яны адстойвалі права грамадзянаў крытыкаваць уладу і абаранялі асноўныя грамадзянскія свабоды. Іх нястомнымі намаганнямі былі задакументаваныя ваенныя злачынствы, парушэнні правоў чалавека і злоўжыванні ўладай. Разам яны паказваюць важнасць грамадзянскай супольнасці для справы міру і дэмакратыі.

Сёлета Нобелеўскую прэмію міру атрымалі праваабаронца Алесь Бяляцкі з Беларусі, расійская праваабарончая арганізацыя «Мемарыял» і ўкраінская праваабарончая арганізацыя «Цэнтр грамадзянскіх свабодаў».

Алесь Бяляцкі быў адным з заснавальнікаў дэмакратычнага руху на Беларусі ў сярэдзіне 1980-х гадоў. Усё сваё жыццё ён прысвяціў працы на карысць дэмакратыі і мірнага развіцця радзімы. У 1996 годзе ён заснаваў праваабарончы цэнтр «Вясна» ў адказ на прыняцце ўрадам спрэчных канстытуцыйных паправак, якія далі прэзідэнту дыктатарскія паўнамоцтвы і тым самым выклікалі масавыя грамадскія пратэсты. «Вясна» падтрымлівала зняволеных пратэстоўцаў і іх сем'і. У наступныя гады «Вясна» ператварылася ў вялікую праваабарончую арганізацыю, якая  пратэставала супраць катаванняў палітычных вязняў і дакументавала ўсе такія выпадкі.

Улады неаднаразова спрабавалі прымусіць Алеся Бяляцкага змоўкнуць. Ён знаходзіўся ў турэмным зняволенні з 2011 па 2014 год. Пасля масавых дэманстрацый супраць рэжыму ў 2020 годзе ён зноў быў арыштаваны і дагэтуль знаходзіцца ў турме, чакаючы суда. Нягледзячы на велізарны ціск з боку ўладаў і сур’ёзную хваробу, Бяляцкі застаўся непахісным у сваёй барацьбе за правы чалавека і дэмакратыю ў Беларусі.

Арганізацыя «Мемарыял» заснаваная ў 1987 годзе праваабаронцамі з былога Савецкага Саюза, якія імкнуліся не дапусціць маніпулявання памяццю пра ахвяраў камуністычнага рэжыму. Сярод заснавальнікаў «Мемарыяла» — лаўрэат Прэміі міру Андрэй Сахараў і праваабаронца Святлана Ганушкіна.

THE NORWEGIAN NOBEL INSTITUTE

Henrik Ibsens gate 51
0255 Oslo
Norway

Tel.: +47 22 12 93 00
E-mail:
postmaster@nobel.no
www.nobelpeaceprize.org

Асноўны прынцып, на якім грунтуецца дзейнасць арганізацыі, — памяць пра злачынствы мінулага ёсць неабходнай умовай для прадухілення новых злачынстваў.

Пасля распаду Савецкага Саюза «Мемарыял» ператварыўся ў найбуйнейшую праваабарончую арганізацыю Расіі. Быў заснаваны архіўны цэнтр, які захоўваў матэрыялы па ахвярах сталінізму. Апроч таго, «Мемарыял» збіраў і сістэматызаваў інфармацыю пра палітычныя рэпрэсіі і парушэнні правоў чалавека ў сучаснай Расіі. «Мемарыял» стаў самай аўтарытэтнай крыніцай інфармацыі пра палітвязняў у расійскіх турмах. У той жа час арганізацыя знаходзілася ў авангардзе барацьбы з мілітарызмам, за правы чалавека і прававую сістэму кіравання ў краіне.

Там, дзе грамадзянскую супольнасць вымушаюць схіліцца перад аўтакратыяй і дыктатурай, наступнай ахвярай нярэдка робіцца мір. Падчас чачэнскіх войнаў «Мемарыял» збіраў і правяраў інфармацыю пра гвалт і ваенныя злачынствы ў дачыненні да мірнага насельніцтва з боку расійскіх і прарасійскіх вайсковых фармаванняў. Непасрэднай рэакцыяй на гэтую працу стала забойства ў 2009 годзе кіраўніцы філіялу «Мэмарыяла» ў Чачні Наталлі Эстэміравай.

Актывісты грамадзянскай супольнасці ў Расіі гадамі зазнавалі жорсткі ўціск: ім пагражалі, іх арыштоўвалі і кідалі за краты, яны знікалі ці іх забівалі. У 2013 годзе «Мемарыял» быў прызнаны «замежным агентам». У снежні 2021 года ўлады пастанавілі прымусова расфармаваць «Мемарыял» і зачыніць назаўжды архіўны цэнтр. Арганізацыя была канчаткова ліквідаваная цягам наступных некалькіх месяцаў, але людзі, што стаяць за «Мемарыялам», не збіраюцца прыпыняць сваю дзейнасць. Каментуючы прымусовы роспуск, старшыня Ян Рачынскі сказаў: «Ніхто не плануе здавацца».

«Цэнтр грамадзянскіх свабодаў» быў заснаваны ў Кіеве ў 2007 годзе, каб працаваць на карысць правоў чалавека і дэмакратыі ва Ўкраіне. Цэнтр прыклаў шмат высілкаў дзеля ўмацавання ўкраінскай грамадзянскай супольнасці, цісnуў на ўлады, каб зрабіць Украіну паўнавартаснай дэмакратыяй. Апроч іншага, цэнтр стаў ініцыятарам далучэння Ўкраіны да Міжнароднага крымінальнага суда, што сталася важным крокам на шляху развіцця Ўкраіны як прававой дзяржавы.

Пасля нападу Расіі на Ўкраіну ў лютым 2022 года «Цэнтр грамадзянскіх свабодаў» сістэматызаваў і дакументаваў ваенныя злачынствы Расіі супраць мірнага насельніцтва Ўкраіны. Разам з міжнароднымі партнёрамі цэнтр імкнецца зрабіць усё магчымае, каб прыцягнуць вінаватых да адказнасці.

Праз сёлетнюю Прэмію міру Алесю Бяляцкаму, «Мемарыялу» і «Цэнтру грамадзянскіх свабодаў» Нарвежскі Нобелеўскі камітэт жадае адзначыць трох

THE NORWEGIAN NOBEL INSTITUTE

Henrik Ibsens gate 51
0255 Oslo
Norway

Tel.: +47 22 12 93 00
E-mail:
postmaster@nobel.no
www.nobelpeaceprize.org

выбітных змагароў за правы чалавека, дэмакратыю і мірнае суіснаванне суседніх краінаў – Беларусі, Расіі і Украіны. Праз сваю паслядоўную падтрымку гуманістычных каштоўнасцяў, антымілітарызму і прававых прынцыпаў сёлетнія лаўрэаты Прэміі зноў ушанавалі ідэал Альфрэда Нобеля – ідэал міру і братэрства народаў, што патрэбны нашаму свету як ніколі раней.

Осла, 7 кастрычніка 2022 года

THE NORWEGIAN NOBEL INSTITUTE

Henrik Ibsens gate 51
0255 Oslo
Norway

Tel.: +47 22 12 93 00
E-mail:
postmaster@nobel.no
www.nobelpeaceprize.org